**24.** У якіх з дадзеных слоў усе зычныя гукі глухія?

*1) хвост; 2) пушынка; 3) падкасіць; 4) сцежка.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**25.** Дадзены сказы:

*Дзяўчынка сама старанна запляла* ***коску*** *і завязала банцік.*

*Вучань правільна паставіў* ***коску*** *ў сказе.*

Выдзеленыя словы ў сказах з'яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі.
**Г)** паронімамамі. **Д)** крылатымі выслоўямі.

---

**26.** Які вершаваны твор называюць "нашым, беларускім гімнам чыстаму каханню"?

**А)** А. Куляшоў "Бывай". **Б)** М. Танк "Завушніцы".
**В)** М. Багдановіч "Зорка Венера". **Г)** П. Броўка "Александрына".
**Д)** Я. Купала "А яна…".

---

**27.** Гэты славуты наш зямляк у 1910 годзе заснаваў у Пецярбургу сваё выдавецтва, дзе выпускаліся творы беларускай літаратуры і музыкі. У зборнікі дзеяч уключаў запісаныя ім пабытавыя, каляндарна-абрадавыя, дзіцячыя песні і песні на словы Я. Купалы, Я. Коласа, Г. Леўчыка, музыку да якіх пісаў сам. Хто гэта?

**А)** Антон Грыневіч. **Б)** Ігнат Храпавіцкі. **В)** Браніслаў Эпімах-Шыпіла.
**Г)** Аляксей Сапуноў. **Д)** Францішак Веранько.

---

**28.** Суаднясіце прозвішчы мастакоў слова з назвамі мясцін, дзе яны нарадзіліся.

*а) Віктар Карамазаў; б) Іван Мележ; в) Якуб Колас; г) Яўгенія Янішчыц.*

*1) Акінчыцы; 2) Чэрыкаў; 3) Гліншчы; 4) Рудка.*

**А)** а-1, б-2, в-3, г-4. **Б)** а-2, б-3, в-1, г-4. **В)** а-4, б-1, в-2, г-3.
**Г)** а-3, б-4, в-1, г-2. **Д)** а-3, б-2, в-4, г-1.

---

**29.** Ёсць у беларускім дойлідстве адметны помнік, які за шматвяковую гісторыю свайго існавання тройчы адкрываў шляхі развіцця архітэктурна-мастацкай культуры Беларусі. Гэта … .

**А)** замак-кастэль у Крэве. **Б)** замак у Геранёнах. **В)** Ляхавіцкі замак.
**Г)** Сафійскі сабор у Полацку. **Д)** Дабравешчанская царква ў Віцебску.

---

**30.** Гэта жанчына – цудоўная спявачка і расказчыца, носьбіт мастацкіх традыцый Тураўшчыны. Падчас палескіх экспедыцый даследчыкі запісалі ад яе шмат песень, легенд, мясцовых павер'яў, апавяданняў аб падзеях ваеннага часу. Песні яе ў адзіночным і ансамблевым выкананні гучаць на дыску "Музычны фальклор беларускага Палесся". Яе завуць … .

**А)** Ганна Паўлаўна Вянгура. **Б)** Амелія Даравінская. **В)** Дар'я Іванаўна Гапеева.
**Г)** Фаіна Паўлаўна Гукала. **Д)** Ізабела Пятроўна Гудвіловіч.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 12900 экз. г. Мінск. 2019 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2019»

*Чацвер, 21 лютага 2019 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Адна з народных песень пачынаецца словамі:

*Кукавала шэрая …*

Якое слова прапушчана?

**А)** сарока. **Б)** варона. **В)** галка. **Г)** зязюля. **Д)** кнігаўка.

---

**2.** *Эпізод, з якога пачынаецца развіццё сюжэта ў мастацкім творы,* называецца … .

**А)** прывязка. **Б)** завязка. **В)** развязка. **Г)** звязка. **Д)** перавязка.

---

**3.** Хто з беларускіх мастакоў слова з'яўляецца аўтарам дадзеных вершаваных радкоў?

*Я ў мастацкім агародзе*
*Толькі марная трава.*
*А якая? Смех, дый годзе:*
*Я – пякучка-крапіва…*

**А)** Паўлюк Трус. **Б)** Карусь Каганец. **В)** Змітрок Бядуля.
**Г)** Язэп Пушча. **Д)** Кандрат Крапіва.

---

**4.** Здаўна ў народзе існуе павер'е, што нельга месці падлогу ў хаце, калі яе жыхар знаходзіцца ў дарозе: нябачныя сляды, пакінутыя ім, як бы дапамагаюць … .

**А)** не стаптаць абутак. **Б)** не забыцца, куды накіраваўся.
**В)** сустрэць усіх знаёмых па дарозе. **Г)** па-за межамі роднай хаты.
**Д)** не замерзнуць у дарозе.

**5.** Колькі дзеясловаў у форме адзіночнага ліку цяперашняга часу ўжыта ў вершаваных радках Якуба Коласа?

*А дождж шуміць, а дождж гудзе,*
*І бліжай-бліжай ён ідзе*
*І даль туманам засцілае.*
*Упала кропля і другая,*
*За імі цэлым вадаспадам*
*Буйныя капкі, як бы градам,*
*Па лісцях дуба секанулі*
*Ды далей сетку пацягнулі.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**6.** З кім параўноўваюцца ў паэме “Слова пра паход Ігаравы” героі твора Усевалад, Ігар, Яраслаўна?
**А)** Усевалад – з турам, Ігар – з гарнастаем, Яраслаўна – з зязюляй.
**Б)** Усевалад – з гарнастаем, Ігар – з турам, Яраслаўна – з зязюляй.
**В)** Усевалад – з турам, Ігар – з зязюляй, Яраслаўна – з гарнастаем.
**Г)** Усевалад – з гарнастаем, Ігар – з зязюлей, Яраслаўна – з турам.
**Д)** Усевалад – з зязюляй, Ігар – з гарнастаем, Яраслаўна – з турам.

**7.** У Тураве ўстаноўлены помнікі славутым дзеячам … . Выберыце правільныя варыянты:
*1) Кірылу Тураўскаму; 2) Мялецію Сматрыцкаму;*
*3) Канстанціну Астрожскаму; 4) Сімяону Полацкаму.*
**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**8.** Вызначце аўтараў літаратурных твораў:
*1) “Леў і сабачка”; 2) “Каштанка”; 3) “Белы пудзель”; 4) “Львы”.*
*а) А. Чэхаў; б) І. Пташнікаў; в) А. Купрын; г) Л. Талстой.*
**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-в, 3-а, 4-г. **В)** 1-г, 2-б, 3-в, 4-а.
**Г)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б. **Д)** 1-а, 2-г, 3-б, 4-в.

**9.** Праславянская назва Дняпра – … .
**А)** Нарва. **Б)** Нарым. **В)** Нара. **Г)** Непра. **Д)** Нерасна.

**10.** Хто з’яўляецца аўтарам старажытнага твора “Прыкуты Праметэй”?
**А)** Эзоп. **Б)** Эсхіл. **В)** Сафокл. **Г)** Арыстафан. **Д)** Гамер.

**11.** Каго з паэтаў мастакі слова называлі “беларускі Ясенін”?
**А)** Паўлюка Багрыма. **Б)** Паўлюка Труса. **В)** Пятра Глебку.
**Г)** Максіма Лужаніна. **Д)** Алеся Якімовіча.

**12.** У 1884 годзе ва ўзросце 82 гадоў Ігнат Дамейка пасля доўгага расстання з Радзімай наведаў родны кут. На памяць аб наведванні Дамейка пасадзіў у Крошыне дрэўца і папрасіў высечы на камені вершаваны подпіс. Якія словы былі высечаны?
**А)** Жыццё кароткае, Радзіма вечная. **Б)** Нашчадкам дзеля прыкладу.
**В)** Чалавецтва ў адказе за жыццё на зямлі. **Г)** Тут дзяцінства басаногі след.
**Д)** Мой родны кут, як ты мне мілы…

**13.** У адрозненне ад адасобленага прыдатка, зваротак … .
Выберыце патрэбныя варыянты:
*1) не выконвае ацэначнай функцыі;*
*2) называе асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца;*
*3) мае аднолькавую граматычную форму з паяснёным словам.*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма патрэбнага варыянта. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**14.** Выберыце з дадзеных няправільна напісаныя ўнутры сказа словазлучэнні:
*1) Мыс Добрай Надзеі; 2) Дом адпачынку; 3) Дом культуры; 4) Палац спорту.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** *Выключны па сваіх вартасцях твор мастацтва, літаратуры, майстэрства – … .*
**А)** шадэўр. **Б)** шэдэўр. **В)** шыдэўр. **Г)** шэдэур. **Д)** шэдэвр.

**16.** *Эзопаўская (эзопава) мова* – гэта … .
**А)** іншасказальнае, алегарычнае выказванне.
**Б)** канкрэтнае выказванне. **В)** прычына спрэчак.
**Г)** уменне свабодна, лёгка і прыгожа гаварыць. **Д)** уменне маўчаць.

**17.** Якое ўстойлівае спалучэнне ўжываецца са значэннем *‘падтрымка на пачатку якой-небудзь дзейнасці’*?
**А)** па вялікім рахунку. **Б)** нясолана хлябаўшы. **В)** пад рукой.
**Г)** на крайні выпадак. **Д)** пуцёўка ў жыццё.

**18.** У якіх прыкладах на месцы пропуску неабходна паставіць коску?
*1) ні даць_ ні ўзяць; 2) ні нашым_ ні вашым; 3) ні слуху_ ні духу.*
**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**19.** Гэты ўстойлівы выраз з аднайменнага апавядання і назвы зборніка твораў М. Стральцова мае значэнне *‘гараджанін у першым пакаленні, ахоплены настальгіяй па роднай вёсцы’*. Выберыце патрэбны варыянт.
**А)** сініца ў руках. **Б)** стаць на крыло. **В)** сена на асфальце.
**Г)** соль зямлі. **Д)** сіняя птушка.

**20.** Колькі назоўнікаў у форме вінавальнага склону ўжыта ў вершаваных радках Л. Геніюш?

*Малюе восень лісце акварэллю*
*Ды круціць ветрам каляровы рой,*
*Чырвоны тон пераплятае зелень,*
*Красуюць дрэвы ў ткані залатой.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**21.** Выберыце з дадзеных прыкладаў тыя словы, якія маюць пяць літар і шэсць гукаў.
*1) Ракаў; 2) Засвір; 3) Усвея; 4) Баяры.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**22.** У якіх словах напісанне адпавядае вымаўленню?
*1) пясчаны; 2) алея; 3) збоку; 4) загадка.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**23.** Дадзены сказ:
*Малы паціху выйшаў з хаты і зайшоў аж на ўскраіну вёскі, доўга стаяў на рагу вуліцы і прыслухоўваўся, ці не пачуе знаёмае дзядулева* ***“но!”***
Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова ў сказе?
**А)** не з’яўляецца членам сказа. **Б)** дзейнікам. **В)** выказнікам.
**Г)** дапаўненнем. **Д)** азначэннем.